## Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР

**Аб узнагароджанні акадэміка Акадэміі навук Беларускай ССР ВАЛАДЗЬКО Л. В. ордэнам Дружбы народаў**

За заслугі ў развіцці фізічнай навукі, падрыхтоўцы кадраў і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння ўзнагародзіць акадэміка Акадэміі навук Беларускай ССР **Валадзько** Леаніда Вікенцьевіча ордэнам **Дружбы народаў.**

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
**Л. БРЭЖНЕЎ.**

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
**М. ГЕАРГАДЗЕ.**

Масква, Крэмль, 30 снежня 1977 г.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 1 (1188) 5 студзеня 1978 г. Цана 2 кап.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

## ВЫХОЎВАЦЬ КАМУНІСТЫЧНУЮ ІДЭЙНАСЦЬ

Партыйнае бюро юрыдычнага факультэта ўдзяляе вялікую ўвагу рабоце па павышэнню ў камуністаў асабістай адказнасці за выкананне партыйнага абавязку. Гэтае пытанне набывае асобую актуальнасць для нашай партарганізацыі, у якой шмат маладых камуністаў (амаль дзве трэці агульнай колькасці). Мы павінны выхоўваць іх у духу высокай камуністычнай ідэйнасці, палітычнай свядомасці і няўхільнага захавання патрабаванняў Статута КПСС.

Сёння на юрыдычным факультэце створана і дзейнічае 15 партыйных груп — 7 на кафедрах, 5 на курсах, 2 у інтэрнатах і 1 на падрыхтоўчым аддзяленні. У партгрупах працуе звыш 300 камуністаў.

Партыйную групу мы разглядаем як асноўнае звяно нашай партарганізацыі. Ад таго, як будуць працаваць партыйныя групы, залежыць у цэлым поспех усёй нашай работы. Таму партбюро факультэта вельмі сур'ёзна падышло да правядзення справаздачна-выбарнай кампаніі ў партыйных групах кафедр і курсаў вясной 1977 года. Партгрупоргамі выбраны камуністы, якія па сваіх палітычных, дзелавых і асабістых якасцях адпавядаюць патрабаванням, якія прад'яўляюцца да партыйнага кіраўніка.

На сходах партыйных груп кафедр і курсаў сістэматычна заслухоўваюцца справаздачы асобных камуністаў аб выкананні імі патрабаванняў Статута КПСС. Такія справаздачы мы разглядаем як адну з эфектыўных форм павышэння адказнасці камуністаў за выкананне Статута партыі.

За мінулы навучальны год на сходах партгруп кафедр і курсаў юрыдычнага факультэта заслуханы справаздачы 58 членаў і кандыдатаў у члены КПСС.

Партбюро факультэта здзяйсняе сістэматычны кантроль за работай партыйных груп, аказвае ім практычную дапамогу. У партбюро штотыднёва (па панядзелках) праводзяцца нарады з партгрупоргамі.

У сістэме мер па павышэнню адказнасці камуністаў за выкананне Статута КПСС вялікая ўвага на факультэце ўдзяляецца ідэйнай загартоўцы членаў партарганізацыі. На факультэце працуюць тры праблемныя тэарэтычныя семінары, створан савет па рабоце з маладымі камуністамі, функцыяніруе школа маладога камуніста, у якой праводзяцца заняткі па вывучэнню Праграмы і Статута КПСС, арганізуюцца сустрэчы з ветэранамі вайны і перадавікамі вытворчасці.

Усё гэта дае свае станоўчыя вынікі. Па выніках летняй экзаменацыйнай сесіі наш факультэт выйшаў на першае месца ва універсітэце па паспяховасці.

Прыкметна ўзрасла і сацыяльна-палітычная актыўнасць камуністаў факультэта. У 1977 годзе камуністы факультэта прынялі актыўны ўдзел у прапагандзе праекта новай Канстытуцыі СССР, імі аказана немалая дапамога іншым партарганізацыям універсітэта ў вывучэнні Асноўнага Закона нашай краіны. Камуністы факультэта А. А. Галаўко, А. В. Дулаў, Я. М. Тагуноў, М. Р. Юркевіч, В. Ф. Чыгір і многія іншыя вядуць вялікую работу па прававой прапагандзе і прававому выхаванню працоўных.

Летам 1977 года студэнтамі-камуністамі факультэта прачытана звыш 140 лекцый па праекту новай Канстытуцыі СССР. 86 студэнтаў працуюць на грамадскіх пачатках у праваахоўных органах Мінска.

Аб узрослай сацыяльна-палітычнай актыўнасці студэнтаў-юрыстаў сведчыць і той факт, што па выніках трэцяга працоўнага семестра студэнцкія будаўнічыя атрады нашага факультэта ў 1977 годзе занялі першае месца ва універсітэце.

Вялікая работа на факультэце вядзецца па ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнцкай моладзі. 31 кастрычніка 1977 года ва ўрачыстай абстаноўцы ў вучэбным корпусе факультэта адкрыта мемарыяльная Дошка памяці выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў Мінскага юрыдычнага інстытута, якія загінулі ў барацьбе з фашызмам у гады Вялікай Айчыннай вайны. Адкрыццё мемарыяльнай Дошкі — гэта вынік доўгай і напружанай працы студэнцкай групы «Пошук».

Дасягнутыя поспехі ў вучэбна-выхаваўчай рабоце для камуністаў факультэта не падстава для самазаспакаення — гэта ўжо поспехі ўчарашняга дня. Акрамя таго, калі з крытычных пазіцый прааналізаваць сучасны стан вучэбна-выхаваўчага працэсу на факультэце, то трэба прызнаць, што ў нас ёсць яшчэ нявыкарыстаныя рэзервы.

Выхаваўчая работа са студэнтамі-камуністамі недастаткова індывідуалізавана. Яна не заўсёды звернута да канкрэтнай асобы, часам носіць групавы характар. Таму выхаваўчыя мерапрыемствы не заўсёды дастаткова эфектыўныя. Часцей за ўсё мы больш працуем сярод актыву, а тыя студэнты, якія асабліва маюць патрэбу ў нашым выхаванні, застаюцца па-за ўвагай. Пакуль яшчэ слабым звяном у рабоце партбюро факультэта з'яўляецца праверка выканання прымаемых рашэнняў. Вядома, што недастаткова прыняць рашэнне. Яно застанецца на паперы, калі за ім не паследуе неабходная арганізатарская работа.

Ёсць яшчэ і некаторыя элементы фармалізму ў правядзенні ідэйна-выхаваўчай работы са студэнтамі. Часам праводзім шмат розных мерапрыемстваў, доўга засядаем, а каэфіцыент карыснага дзеяння — невялікі. Відаць, лепш праводзіць менш мерапрыемстваў, але рабіць гэта з душой, па-дзелавому і больш арганізавана. Вельмі добра аб гэтым сказаў Л. І. Брэжнеў на XVI з'ездзе прафсаюзаў СССР: «Не колькасць папер, не колькасць і працягласць пасяджэнняў, а дакладная палітычная накіраванасць, дзелавітасць, практычныя вынікі — вось крытэрыі, па якіх можна і патрэбна ацэньваць грамадскую работу».

Аналіз разгледжаных персанальных спраў на факультэце сведчыць аб тым, што асобныя камуністы не выконваюць свайго партыйнага абавязку, ганьбяць высокае званне камуніста. Гэтых персанальных спраў магло б і не быць, калі б партыйныя групы заўсёды своечасова і прынцыпова рэагавалі на няправільныя паводзіны некаторых камуністаў.

Партбюро факультэта прымае ў цяперашні час меры па ліквідаванню адзначаных недахопаў.

**В. ЦІХІНЯ,**
**сакратар партбюро юрыдычнага факультэта, дацэнт.**



Зазірнём яшчэ раз у падручнік...

Фота **В. Драчова.**

## ЯК РЫХТАВАЦЦА ДА ЗАЛІКАЎ І ЭКЗАМЕНАЎ

**(Працяг. Пачатак у № 36 за 1977 г.).**

**М. У. ПІСКУНОЎ,**
**доктар педагагічных навук, прафесар, загадчык кафедры педагогікі**

Прыступаючы да паўтарэння вучэбнага матэрыялу, студэнт заўсёды сустракаецца з цэлым шэрагам пытанняў, такіх, як: з чаго пачынаць паўтарэнне; як прыступіць да паўтарэння; як укласціся ў часе; якім чынам паўтараць вучэбны матэрыял.

Адказваючы на першае пытанне, належыць адзначыць, што пачынаць паўтарэнне трэба з аналізу вучэбнай праграмы па прадмету, у працэсе якога студэнт адзначае, на якія тэмы або раздзелы належыць звярнуць асаблівую ўвагу. Гэта дазволіць яму правільна спланаваць час і больш спыніцца іменна на гэтых слаба засвоеных у час лекцый раздзелах праграмы. Нямэтазгодна паўтараць вучэбны матэрыял па білетах ці пытаннях, бо пры гэтым парушаецца сістэма ведаў і магчымы пропускі асобных тэм ці раздзелаў праграмы, што вядзе да іх недапрацоўкі.

Важным з'яўляецца і пытанне аб тым, якімі спосабамі належыць весці паўтарэнне вучэбнага матэрыялу. Існуе некалькі такіх спосабаў. Адным з найбольш педагагічна мэтазгодных з'яўляецца дакладнае і дэталёвае паўтарэнне ўсяго вывучанага па таму ці іншаму прадмету вучэбнага матэрыялу. Такое паўтарэнне дазволіць дабіцца цвёрдых і трывалых ведаў, а, такім чынам, і высокай адзнакі на экзамене. Другім не менш абгрунтаваным спосабам паўтарэння з'яўляецца дакладная сістэматызацыя вучэбнага матэрыялу на аснове раней устаноўленых студэнтамі сувязей паміж асобнымі тэмамі і раздзеламі. Гэты спосаб дазваляе засвойваць вучэбны матэрыял як цэлы, лагічна стройны змест прадмета.

У выключных выпадках прымяняецца і трэці спосаб паўтарэння вучэбнага матэрыялу — беглы прагляд яго. Ён прымянімы толькі ў тым выпадку, калі студэнт на працягу ўсяго вучэбнага года добрасумленна прапрацоўваў увесь матэрыял. У іншых жа выпадках ён мала эфектыўны. Напрыклад, пры павярховай, неглыбокай прапрацоўцы вучэбнага матэрыялу гэты спосаб паўтарэння не паглыбіць яго, не палепшыць яго якасці.

Часам прымяняецца і чацвёрты спосаб паўтарэння — разгляд толькі некаторых пытанняў з усяго матэрыялу, выбраных наўгад. Адразу патрэбна заўважыць, што гэты спосаб амаль неэфектыўны. Больш таго, ён у сваёй аснове характарызуецца фармальным падыходам да працэсу навучання. Прымяняюць яго толькі тыя студэнты, якія не імкнуцца атрымаць надзейныя і трывалыя веды. Вопыт паказвае, што такім студэнтам цяжка бывае здаць экзамен не толькі з першага, але і з пятага разу.

Прыступаючы да паўтарэння канкрэтнага раздзела, студэнт павінен устанавіць важнейшыя паняцці, палажэнні, гіпотэзы, фармуліроўкі, меры і задачы з тым, каб на экзамене выкарыстоўваць іх у якасці практычнага падмацавання тэарэтычных палажэнняў.

Пры паўтарэнні кожнага раздзела ў студэнта маюцца чатыры крыніцы — канспекты лекцый, падручнік, запісы з рэкамендаванай літаратуры і заметкі, зробленыя на кансультацыях або семінарскіх занятках.

З якой жа крыніцы належыць пачынаць? Даследаванні паказваюць, што паўтарэнне лепш за ўсё трэба пачынаць з чытання канспекта лекцый, затым можна прыступаць да чытання падручніка і ў заключэнне да прагляду запісаў з рэкамендаванай літаратуры і заметак на кансультацыях і семінарах.

Чым жа тлумачыцца такі парадак паўтарэння? У канспектах лекцый, як вядома, запісана ўсё галоўнае ў сціслай і кароткай форме, прытым з улікам усіх навейшых дасягненняў данай навукі. Таму іменна з гэтага галоўнага і належыць пачынаць паўтарэнне канкрэтнага курса. Але гэтым нельга абмяжоўвацца, бо універсітэцкія дысцыпліны студэнт павінен засвоіць шырока. А гэта можа

**(Заканчэнне на 2-й стар.).**

# ПАСТАНОВА

## БЮРО КАМІТЭТА КАМСАМОЛА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА АБ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ СПАБОРНІЦТВЕ ЗА ГАНАРОВАЕ ПРАВА ПАДПІСАЦЬ РАПАРТ ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ КПСС ДА 60-ГОДДЗЯ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА

**У сувязі з прадстаячай важнай падзеяй у гісторыі Ленінскага камсамола — 60-годдзем з дня нараджэння і падрыхтоўкай да яго бюро камітэта камсамола**

**пастанаўляе:**

У адпаведнасці з рашэннем XXVII справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі БДУ разгарнуць у камсамольскіх арганізацыях універсітэта сацыялістычнае спаборніцтва за ганаровае права падпісаць Рапарт Цэнтральнаму Камітэту КПСС да 60-годдзя Ленінскага камсамола.

Задача камсамольскіх арганізацый факультэтаў, курсаў, груп заключаецца ў тым, каб прыцягнуць да спаборніцтва за ганаровае права падпісаць Рапарт ЦК КПСС да 60-годдзя Ленінскага камсамола ўсіх камсамольцаў. Арганізуючы сацспаборніцтва, неабходна звярнуць увагу на выкананне кожным камсамольцам асабістых комплексных планаў «Вучымся камунізму, будуем камунізм!»

Сацыялістычнае спаборніцтва павінна быць арганізавана ў кожнай нізавой камсамольскай арганізацыі. Камітэтамі камсамола факультэтаў і падраздзяленняў, актывамі груп здзяйсняецца прамежкавае і канчатковае (кастрычнік 1978 г.) падвядзенне вынікаў. На кожным этапе ў нізавых камсамольскіх арганізацыях вызначаецца пераможца, прозвішча якога заносіцца ў мандат пераможцы спаборніцтва.

**ЭТАПЫ СПАБОРНІЦТВА:**

1. 29 кастрычніка 1977 г.—15 лютага 1978 г.
2. 15 лютага 1978 г.—22 красавіка 1978 г.
3. 22 красавіка 1978 г.—25 чэрвеня 1978 г.
4. 25 чэрвеня 1978 г.—15 кастрычніка 1978 г.

Пры правядзенні прамежкавых этапаў неабходна звярнуць увагу на аб'ектыўны падыход да вызначэння пераможцы, на недапушчальнасць фармалізму ў арганізацыі гэтага важнага палітычнага мерапрыемства. Права падпісаць Рапарт прадастаўляецца лепшым з лепшых камсамольцаў, выдатнікам вучобы, грамадскім актывістам, ударнікам СБА. Прысуджаецца гэта ганаровае права рашэннем камсамольскага сходу ў кожнай нізавой арганізацыі.

Падпісанне Рапарта пераможцамі спаборніцтва праводзіцца ва ўрачыстай абстаноўцы з удзелам ветэранаў вайны і працы, партыі і камсамола. Рапарт павінен адлюстроўваць усю работу камсамольскай арганізацыі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна па падрыхтоўцы да дастойнай сустрэчы знамянальнай падзеі — 60-годдзя Ленінскага камсамола.

Пераможцам спаборніцтва, якія падпісалі Рапарт, пакідаецца на памяць мандат пераможцы за подпісам сакратара камітэта камсамола універсітэта, ім уручаюцца памятныя падарункі, іх імёны заносяцца ў Кнігу славы камсамольскай арганізацыі БДУ.

Правесці падпісанне Рапарта пераможцамі спаборніцтва на факультэтах ва ўрачыстай абстаноўцы да 20 кастрычніка 1978 г.

Камітэтам камсамола арганізаваць фатаграфаванне пераможцаў ля сцяга Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, аформіць стэнды «Пераможцы спаборніцтва», весці экраны.

Камітэтам камсамола факультэтаў і падраздзяленняў пры правядзенні спаборніцтва шырока выкарыстаць вопыт, назапашаны пры арганізацыі спаборніцтва за права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола XXV з'езду КПСС і Цэнтральнаму Камітэту КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка.

# УЛЮБЁНЫ Ў СВАЮ ПРАФЕСІЮ

— Уладзіміра Міхайлавіча Лазоўскага, выкладчыка беларускай мовы, мы паважаем і шчыра любім, — сказалі мне студэнткі філалагічнага факультэта Антаніна Ягоранка і Ірына Бурак. — Ён не патрабуе ад нас бяздумнага выканання практыкаванняў, а імкнецца заўсёды так расказаць новае, каб мы ўспрымалі яго ярка, вобразна, свядома.

Заслужыць пахвалу ў выкладчыка нялёгка. Ён вельмі патрабавальны. Разам з тым любіць вясёлым жартам узняць настрой, а шчырая, даверлівая ўсмешка ўражвае сілай нерастрачанай дабраты.

Уладзімір Міхайлавіч — улюбёны ў сваю прафесію педагог. Педагог... Іменна гэтае слова найбольш дакладна характарызуе яго. Ён выдатна ведае свой прадмет; гэтае веданне памножана на глыбокае веданне жыцця, чалавечых характараў, псіхалогіі студэнтаў. Умее ісці ў нагу з часам, умее выбраць і творча прымяніць тое новае і карыснае, што прапануе педагагічная навука. Цяпер, напрыклад, шукае спосабы павелічэння шчыльнасці лекцыі, каб ні адна хвіліна не была страчана дарма. Упэўнены, што многае залежыць ад якасці падрыхтоўкі да лекцыі і ад самаадукацыі.

Самаадукацыя — надзейны, шматгадовай практыкай выпрацаваны метад павышэння ідэйна-палітычнага, інтэлектуальнага ўзроўню выкладчыка, яго прафесіянальнай загартоўкі.

Сучасны выкладчык павінен быць не проста адукаваным, але і духоўна багатым чалавекам, павінен умець перадаваць гэтае багацце тым, за выхаванне каго нясе адказнасць. Кожная памылка можа глыбока раніць чулае сэрца.

Кажуць, студэнцкія гады — самыя памятныя. Гэта не залежыць ад таго, у які час ты быў студэнтам.

...Незабыўная для У. М. Лазоўскага першая лекцыя ва універсітэце ў тыя далёкія 50-я гады. Да кожнай ён рыхтаваўся з вялікай адказнасцю; шмат прыйшлося папрацаваць, перш чым навучыўся весці дыскусію, пачаў ясна і лаканічна выказваць свае думкі.

— Самастойнасць і яшчэ раз самастойнасць — вось той шлях, па якому мы павінны ісці, — гаворыць дацэнт. — Гэта дапамагае вырашыць многія пытанні развіцця творчых магчымасцей, росту зацікаўленасці вучобай, прадметам, увогуле працай.

Уладзімір Міхайлавіч не цураецца вучыцца ў іншых. У той жа час умее педагагічна тонка правесці сваю лінію, сваю думку. Ён умее выклікаць у сваіх студэнтаў прагу да ведаў.

Шмат клопатаў і турбот ва Уладзіміра Міхайлавіча, але ён знаходзіць час для грамадскай, навуковай работы. Зараз, напрыклад, У. М. Лазоўскі распрацоўвае тэмы па лексікалогіі. Распачата работа і над іншымі тэмамі.

Неспакойны характар у гэтага чалавека. Ён жыве думкамі аб добрым навучанні і выхаванні студэнтаў, аб тым, каб яго вучні сталі сапраўднымі настаўнікамі, людзьмі высокай вартасці.

**А. МАРЧУК.**



Даўно ўстанавіліся трывалыя сувязі паміж вылічальным цэнтрам БДУ і Мінскім радыётэхнічным інстытутам. Абмен вопытам праводзіцца на аснове эксплуатацыі і выкарыстання ЭВМ у вучэбным працэсе.

Вось што аб гэтым супрацоўніцтве сказаў начальнік вучэбнай інфармацыйна-вылічальнай лабараторыі Л. Вянчацкі:

— Вылічальны цэнтр БДУ прадставіў матэрыялы падсістэмы АСК «Налічэнне заработнай платы». Супрацоўнікі ВЦ БДУ аказалі вялікую дапамогу ў кансультацыі па ўкараненню і эксплуатацыі гэтай падсістэмы.

**На здымку:** за працай супрацоўнік ВЦ РТІ Алена Чэрнікава. Яна студэнтка вячэрняга аддзялення па спецыяльнасці ЭВМ. Ёю унесены рацыяналізатарскія прапановы па паляпшэнню абслугоўвання вучэбнага працэсу, па больш эфектыўнаму выкарыстанню машыннага часу. Зараз Алена працуе над дыпломам.

**У. НОСАЎ,**
**студэнт I курса журфака.**
Фота аўтара.

...Адкуль паступае метал на прадпрыемствы Гомеля? Па якім газаправодзе ідзе туды газ і адкуль? Шмат пытанняў — адно за адным — паступае да Люды Шэсцель. На ўсе трэба даць змястоўны адказ. Штосьці не ведаеш? Нічога страшнага, пытанне можна разабраць разам або папрасіць дапамогі ў выкладчыка Н. І. Жураўскай.

Вось так цікава, у гарачых спрэчках і дыскусіях праходзяць усе пасяджэнні гуртка эканамічнай геаграфіі СССР на геафаку. Мы прысутнічалі на адным з іх. У цэнтры ўвагі — даклад студэнткі IV курса Л. Шэсцель «Сучасны стан і перспектывы развіцця машынабудавання Гомельскай вобласці».

Люда расказвае спакойна, упэўнена; яна амаль не заглядвае ў канспект даклада. Падрыхтаваныя дакладчыкам схемы, малюнкі студэнты ўспрымаюць са шчырай цікавасцю. Выступленне Шэсцель закончана.

# З ПРАФЕСІЙНАЙ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЮ

...Гасне святло. На белым палатне кадр за кадрам мільгаюць карціны суровай паўночнай прыроды, віды старэйшых паўночных гарадоў, старажытнейшыя помнікі архітэктуры. Паказ слайдаў суправаджае цікавы расказ Аляксандра Фралова. Саша — адзін з удзельнікаў падарожжа студэнтаў III курса геафака на поўнач нашай краіны. Маршрут падарожжа: Ленінград — Петразаводск — Мурманск — Апатыты—Архангельск—Масква — Мінск. У паходзе ўдзельнічалі І. Каржуева, В. Басякова, Л. Сушкевіч, В. Шведаў і іншыя. І зараз студэнты спяшаюцца падзяліцца ўражаннямі, расказваюць аб найбольш запомніўшымся, дапаўняюць адзін аднаго. Падарожнікі памятаюць не толькі асноўныя асаблівасці прыроды гэтых мясцін, але дзе якая глеба пераважае, што на ёй расце, якія горныя пароды сустракаюцца. Іх цікавасць не прамінула і тое, з чаго зроблены старадаўнія помнікі, архітэктурныя будынкі.

Гурток эканамічнай геаграфіі СССР дзейнічае з часу стварэння кафедры эканамічнай геаграфіі. Больш чатырох гадоў ім кіруе Ніна Іванаўна Жураўская.

— Кожны семестр строга па плану адбываецца не менш пяці пасяджэнняў гуртка, — расказвае Ніна Іванаўна. — Часта на пасяджэннях выступаюць студэнты з матэрыяламі аб летніх вытворчых практыках. Нярэдка гасцямі гуртkоўцаў бываюць прадстаўнікі розных навуковых устаноў. Студэнты арганізуюць усемагчымыя экскурсіі, паходы. Штогод гурток прадстаўляе навукова-даследчыя работы на гарадскі агляд студэнцкіх работ і на студэнцкія навуковыя канферэнцыі. Як правіла, работы заслугоўваюць высокай адзнакі.

Трэба сказаць, што наогул навуковая дзейнасць студэнтаў пастаўлена на факультэце нядрэнна. СНТ перыядычна інфармуе аб сваёй рабоце партбюро і дэканат геафака. Зразумела, што ў поспехах студэнтаў вялікая заслуга выкладчыкаў факультэта, але ўсё ж галоўнае, што адказнасць за навуковую работу перш за ўсё нясуць самі студэнты.

**Д. БЫКАВА.**

# ЯК РЫХТАВАЦЦА ДА ЗАЛІКАЎ І ЭКЗАМЕНАЎ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).**

даць толькі падручнік. Вось чаму ўслед за канспектам лекцый павінна ісці работа з падручнікам і дапаможнікамі. У сувязі з гэтым узнікае пытанне: ці нельга абмежавацца пры паўтарэнні курса прапрацоўкай аднаго толькі падручніка? Аказваецца, нельга, таму што падручнік можа не адлюстроўваць некаторых навейшых даных, бо падручнікі перавыдаюцца не часта, а навука не стаіць на месцы, яна хутка развіваецца, у ёй паяўляюцца ўсё новыя даныя і адкрыцці. Гэтыя даныя і адкрыцці, а таксама іншыя новыя дасягненні, якіх няма пакуль у падручніках, змяшчаюцца ў канспектах лекцый і іншых упамінаўшыхся намі крыніцах — запісах з рэкамендаванай літаратуры і заметках, зробленых на кансультацыях і семінарскіх занятках. Адсюль вынікае наступнае педагагічнае правіла: для глыбокага засваення ведаў усе крыніцы паўтарэння — канспекты лекцый, падручнікі, запісы з рэкамендаванай літаратуры і заметкі студэнтаў, зробленыя імі на кансультацыях і семінарскіх занятках,—мэтазгодна выкарыстоўваць у адзінстве.

Важная і такая метадычная парада. Вядома, што адны студэнты пры паўтарэнні вучэбнага матэрыялу чытаюць уголас, іншыя — пра сябе. У гэтым выпадку найбольш прыймальнымі з'яўляюцца індывідуальныя формы работы. На той жа стадыі, калі матэрыял паўторан і засвоен, педагагічна мэтазгодна індывідуальныя формы работы спалучаць з калектыўнымі. Вельмі карысна, напрыклад, бывае пераказаць вывучаны матэрыял сваім таварышам, адказаць на іх пытанні, выслухаць іх расказы, самому задаваць пытанні і выслухоўваць адказы і, калі ўзнікне неабходнасць, уносіць папраўкі. У тым жа выпадку, калі ўсё ж і пасля гэтага застаюцца незразумелымі для студэнтаў некаторыя пытанні, іх можна высветліць на кансультацыях. Апошнія трэба заўсёды ўмець максімальна выкарыстоўваць не толькі для запаўнення прабелаў, выяснення незразумелага, вырашэння цяжкасцей, але і для паглыблення і сістэматызацыі ведаў.

І, нарэшце, самы адказны момант — студэнт уваходзіць у экзаменацыйную аўдыторыю, атрымлівае экзаменацыйны білет і садзіцца за асобны столік. З чаго належыць пачынаць падрыхтоўку да адказаў на пытанні білета? Доўгі вопыт пераконвае, што спачатку трэба ўважліва прачытаць кожнае пытанне білета, удумацца ў іх змест, скласці план і прыступіць да напісання канспекта адказу. І, канешне, няправільна паступаюць тыя студэнты, якія пры атрыманні білетаў адразу ж пачынаюць пісаць канспекты. У выніку такія канспекты, як правіла, атрымліваюцца шматслоўнымі, расплывістымі, а часам і зусім не адлюстроўваючымі сутнасці пытанняў. Да канспекта трэба прыступаць не адразу, а пасля дакладнага вывучэння пытанняў, глыбокага роздуму над імі. Тады і канспект атрымаецца кароткім і дакладным, што ў сваю чаргу станоўча адаб'ецца на якасці адказу і яго адзнацы.

Кульмінацыйным момантам з'яўляецца адказ студэнта экзаменатару. Якім ён павінен быць? Адказваць студэнт павінен няспешна, спакойна, з высокім патрабаваннем да культуры мовы, грунтоўна, з выкладаннем усяго аб'ёму патрабуемых ведаў. Асаблівую ўвагу належыць звярнуць на раскрыццё практычнай значымасці набытых ведаў, іх прымянення ў жыцці, у практыцы камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

# ВУЧЫЦЦА КІРАВАЦЬ САБОЙ

Ужо шмат год функцыянуе пры кафедры псіхалогіі студэнцкі навуковы гуртон «Псіхолаг». Члены гуртка займаюцца рознымі праблемамі псіхалагічнай навукі. Кіраўніцтва гуртком здзяйсняе загадчык кафедры дацэнт Р. І. Вадэйка. Сучасныя прылады і абсталяванне дазваляюць праводзіць сур'ёзныя эксперыментальныя даследаванні. Навуковыя работы членаў гуртка не раз прадстаўляліся на штогадовыя рэспубліканскія і ўсесаюзныя конкурсы.

З верасня 1976 года з даследуемых праблем у рабоце гуртка вызначылася вядучая, ключавая — аутагенная трэніроўка як метад псіхалагічнай самарэгуляцыі. Што ж такое АТ? Гэта сістэма навукова абгрунтаваных практыкаванняў, накіраваных на развіццё навыкаў і здольнасцей самаўнушэння. Здзяйсняецца АТ на фоне агульнага спакою чалавека і расслаблення мышц усяго цела, на фоне стану, які называецца рэлаксацыяй. Апошні час аутатрэнінг усё шырэй выкарыстоўваецца для рэгулявання нервова-эмацыянальнага стану, аднаўлення сіл пасля напружанай разумовай ці фізічнай працы, а таксама і з псіхатэрапеўтычнымі мэтамі. Выбар такой тэматыкі цікавы і з пункту гледжання авалодання тэхнікай і методыкай АТ, і ў плане вывучэння фізіялагічных механізмаў яе ўздзеяння на арганізм чалавека.

Такім чынам, перад членамі гуртка былі пастаўлены як практычныя, так і тэарэтычныя задачы.

І сёння, калі ззаду ўжо цэлы год заняткаў, можна сказаць, што задачы гэтыя паспяхова рашаюцца. Урач-псіхатэрапеўт Г. Я. Мазо сістэматычна праводзіць практычныя заняткі, а раз у месяц гуртон збіраецца на пасяджэнні, дзе абмяркоўваюцца даклады і эксперыментальныя работы яго членаў. Гуртноўцы прынялі актыўны ўдзел у XXXIV студэнцкай навуковай канферэнцыі, якая праводзілася 13—14 красавіка 1977 года; адно з пасяджэнняў секцыі псіхалогіі было цалкам прысвечана тэарэтычным пытанням аутатрэнінга.

Што ж датычыцца рашэння пастаўленых практычных задач, то і тут дасягнуты пэўныя поспехі: члены гуртка, якія займаюцца ў ім з верасня 1976 года, авалодалі першай ступенню АТ, палепшылі сваю памяць, устойлівасць увагі, навучыліся пераадольваць вялікае хваляванне на экзаменах, якое перашкаджае студэнту актывізаваць у памяці раней вывучаны вучэбны матэрыял.

У пачатку гэтага навучальнага года ў біяграфіі калектыву адбылася вельмі радасная і знамянальная падзея: ён быў узнагароджан граматай як адзін з лепшых гурткоў.

Зараз гуртон працягвае сваю работу ўжо расшыраным саставам: наперадзе — даследаванне многіх цікавых праблем псіхалогіі і ў прыватнасці аутагеннай трэніроўкі.

М. МАЖЭЙКА,
студэнтка III курса
гістфака, аддзялення
філасофіі.



НА ЗДЫМКУ: студэнтка пятага курса аддзялення філасофіі гістфака Раіса Валіева праводзіць эксперыментальнае даследаванне механізмаў успрымання часу.

Фота Д. ПРЭСА.

# У ГЛЫБІНІ ВЕДАЎ

У Справаздачным дакладзе ЦК КПСС XXV з'езду партыі падкрэслена: «У сучасных умовах, калі аб'ём неабходных для чалавека ведаў рэзка і хутка ўзрастае, ужо немагчыма рабіць галоўную стаўку на засваенне пэўнай сумы фактаў. Важна прывіваць уменне самастойна папаўняць свае веды, арыентавацца ў імклівым патоку навуковай і палітычнай інфармацыі».

Гэту мэту і ставіць перад сабой студэнцкае навуковае таварыства факультэта журналістыкі. З просьбай расказаць аб дзейнасці таварыства я звярнуўся да яго старшыні Васіля ВАРАБ'ЁВА, студэнта IV курса, выдатніка вучобы.

**— Колькі студэнтаў займаецца ў таварыстве?**

Усяго ў навуковым таварыстве займаецца звыш 100 чалавек. У нас дзейнічаюць гурткі радыё- і тэлебачання, крытыкі, стылістыкі, публіцыстыкі і гісторыі савецкай журналістыкі. Найбольш папулярнымі сярод студэнтаў лічацца гурткі крытыкі і стылістыкі: студэнты гэтых гурткоў арганізуюць цікавыя сустрэчы і гутаркі з вядомымі пісьменнікамі і паэтамі Беларусі, дзеячамі навукі і мастацтва. Напрыклад, зараз рыхтуецца наведанне тэатра імя Янкі Купалы і абмеркаванне разам з артыстамі п'есы «Аптымістычная трагедыя».

**— Калі адбылася апошняя студэнцкая навуковая канферэнцыя? Якія яе вынікі?**

— У гэтым годзе ў нашай краіне адбыліся дзве значныя падзеі. 7 кастрычніка наш народ прыняў новую Канстытуцыю СССР. А праз месяц мы святкавалі 60-годдзе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Гэтаму і была прысвечана навуковая канферэнцыя. На ёй было прачытана 15 дакладаў. Глыбокая зацікаўленасць навуковай працай заўважаецца сярод малодшакурснікаў. Некаторыя з іх ужо выступалі з дакладамі на канферэнцыі. Напрыклад, многіх зацікавіў даклад студэнта II курса Уладзіміра Бельскага «Развіццё сацыялістычнае грамадства — трыумф ідэй Вялікага Кастрычніка».

Увогуле канферэнцыя прайшла цікава.

**— Ці існуе сувязь таварыства з іншымі ВНУ?**

— Мы падтрымліваем цесныя кантакты з універсітэтамі Масквы, Ленінграда, Кіева, Львова. Вясной гэтага года да нас прыязджалі львоўскія студэнты. У сваю чаргу Г. Сідаровіч і я былі ў Львове.

**— Заняткі ў студэнцкім навуковым таварыстве не перашкаджаюць вучобе?**

— Наадварот! Веды, набытыя ў час навуковай працы, дапамагаюць пры здачы залікаў і экзаменаў, расшыраюць кругагляд. Я запрашаю студэнтаў малодшых курсаў да нас у таварыства. Заняткі ў ім пойдуць толькі на карысць.

У. ДЗЯТЧЫК.

## ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА

# Крокі ў педагагічную паэму

Настаўнік... Кожны чалавек вымаўляе гэтае слова з павагай, з любоўю, з вялікай удзячнасцю тым, хто навучыў яго любіць Радзіму, пісаць, чытаць, пераадольваць цяжкасці. Мабыць і зараз, ды і не адзін раз, у думках звярнуўся кожны студэнт-пяцікурснік, які праходзіць педпрактыку ў школе, за парадай, дапамогай да свайго любімага настаўніка. Але толькі ў думках. Бо рана ці позна настае ў жыцці кожнага з нас час, калі ты ўжо павінен усё рашаць сам і не маеш права памыляцца. Хутка сённяшнія пяцікурснікі стануць настаўнікамі. А пакуль — практыка. Кожны пяцікурснік мае свой клас, свайго метадыста з ліку ўжо вопытных педагогаў, які сочыць за работай пачынаючага настаўніка, дапамагае яму разабрацца ў складаным, дзеліцца сваімі метадамі правядзення ўрокаў, знаёміць з многімі, невядомымі зараз студэнту, сакрэтамі спецыяльнасці.

І як жа спраўляюцца са сваімі новымі абавязкамі філалагі-пяцікурснікі? Гэта пытанне мы задаём студэнту філфака, старасце V курса Віктару Каратай.

— Пакуль што педагагічная практыка праходзіць без надзвычайных здарэнняў. Скаргаў на студэнтаў няма. Наадварот, нашымі практыкантамі задаволены, бо працуюць яны з агеньчыкам, стараюцца і душу, і сэрца, і свае веды аддаць дзецям. Любоў да сваёй прафесіі дапамагае ў рабоце са школьнікамі Людзе Ільюшынай, Валянціне Калікавай, Ніне Лысюк; дзяўчаты працуюць у 70-й школе горада Мінска.

1 снежня пачаўся ў студэнтаў другі этап педпрактыкі — стажорская практыка. У чым яна заключаецца?

Студэнтам дазваляецца самім, без нагляду метадыста, праводзіць урок, ставіць адзнакі за чвэрць. Акрамя гэтага, практыкант павінен весці і паклясную работу з вучнямі, гэта значыць, што на некаторы час ён павінен замяніць ім класнага кіраўніка.

Педагагічная практыка — вынік чатырох год вучобы ва універсітэце, гэта дасягненне мэты, да якой кожны ўпарта ішоў доўгі час. Педпрактыка паказала, што многія студэнты ведаюць свой прадмет і ў будучым стануць добрымі настаўнікамі. Ужо зараз, праводзячы свае першыя ўрокі, яны шукаюць новыя формы і метады работы, выкарыстоўваюць пры растлумачэнні матэрыялу музыку, рознага роду пісьмы, факты з паўсядзённага жыцця, імкнуцца праводзіць урокі так, каб было цікава і вучням, і ім. Педагогі-метадысты адзначаюць высокі ўзровень падрыхтоўкі практыкантаў. У той жа час практыка паказала, што не ва ўсіх студэнтаў ідзе ўсё гладка, ёсць і цяжкасці.

Г. ГРЭЛЬ,
І. ГУСЬКО.
(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).

# Выпрабаванне крылаў

«Як сустрэнуць? Ці змагу растлумачыць матэрыял? Ці знайду агульную мову?» — з такімі думкамі першы раз у жыцці ўваходзіў у клас у якасці настаўніка Міхаіл Струк, студэнт V курса геаграфічнага факультэта.

Педагагічную практыку Міхаіл праходзіць у 116-й школе горада Мінска. Больш двух месяцаў яму давядзецца быць настаўнікам.

Першы ўрок...

— Калі я ўпершыню ўваходзіў у клас, то хваляваўся больш, чым пры паступленні ва універсітэт, — расказваў Міхаіл пасля, калі першы ўрок быў ужо за плячыма.

...Ён акінуў позіркам клас: дзесяткі вачэй пільна ўглядаліся ў новага настаўніка, нібыта пыталі: што ты за чалавек, што раскажаш? Цішыня працягвалася нядоўга — урок пачаўся. Ляцелі імклівыя хвіліны. Разгублена Міхаіла паступова праходзіла, усё станавілася на свае месцы. І вось першы адказ, першая адзнака — пяцёрка. Шчыра кажучы, Міхаіл вельмі хацеў, каб першай адзнакай, якую ён паставіць вучням, была пяцёрка. «Мабыць, гэта крыху сімвалічна: добрая адзнака — добры пачатак», — гаварыў, усміхаючыся, Міхаіл.

Зараз Міхаіл успамінае, як пасля ўрока да яго падышла старая настаўніца, якая прысутнічала на ўроку, і, паціснуўшы руку, сказала: «Вы — настаўнік».

Камісія атэставала першы ўрок Мішы на выдатна.

Больш дакладна Міхаіл памятае свае наступныя ўрокі. Кожны — новыя адкрыцці і адкрыццё новага ў вучнях і ў самім сабе.

...Увагу Міхаіла прыцягнулі дзве дзяўчынкі, якія надзвычай моцна шапталіся, часта глядзелі на яго. У чым справа? Міхаіл вырашыў заўваг не даваць, а проста выклікаць адну з вучаніц, і быў здзіўлен, калі пачуў выдатны, змястоўны адказ. Аказваецца, дзяўчынкі цудоўна ведалі ўрок, але сароміліся падняць рукі, ім хацелася звярнуць на сябе ўвагу. І наогул яго шосты клас — «людзі цікавыя і сур'ёзныя». За некалькі ўрокаў Міхаіл паспеў добра пазнаёміцца з усімі. Цяпер можа сам дзяліцца педагагічнымі «сакрэтамі»: адзін вучань патрабуе трохі больш увагі да сябе, другі — наадварот.

Неяк, праходзячы ў час перапынку па калідоры, Міхаіл пачуў, як школьнік казаў свайму сябру: «Гэта наш пайшоў... настаўнік што трэба!».

Міхаіл — выдатнік вучобы, ленінскі стыпендыят, староста курса.

Вось што гаварыў пра яго сябар Аляксандр Сінягуб:

— Міхаіл — гэта калектывіст, ён заўсёды ў калектыве, ён жыве калектывам. Ад яго заўсёды можна атрымаць дапамогу, параду. Якім я бачу Міхаіла ў недалёкім будучым, пасля заканчэння універсітэта?

— Гэты чалавек на сваім месцы.

П. РАМАНЧУК.
(Прэс-цэнтр камітэта камсамола)

Традыцыйнымі сталі на факультэце журналістыкі сустрэчы з вядомымі пісьменнікамі і журналістамі. Нядаўна студэнты горача віталі Валянціна Панамарова, які прыйшоў да іх падзяліцца сакрэтамі журналісцкага майстэрства, расказаць аб сваёй рабоце ў «Правде», «Известиях», «Литературной газете».

Фота М. ФЕДАРЭНКІ.








В. БАРЫСЕВІЧ

## ПУСТЫЯ АРЭХІ

**Вось і лес, мясціна тая.**
**Рэчка хвалямі гуляе.**
**Тут з табою, як прыехаў,**
**Рвалі звонкія арэхі.**
**Я цяпер адзін-адзіны,**
**Цёплых думак — успаміны.**
**Кожны крок — нібыта рэха.**
**І пустыя ўсё арэхі.**



Л. ЯЦЭВІЧ

Рабіны полымя і лесу
пазалота —
Вы вабіце асенняю парой.
Апошні крык бусліны
на балотах
Напоўнен невыказнаю тугой.
На сэрцы і трывожна,
і ласкава,
З грудзей дзявочых песня
хлыне зноў,
Калі цябе я прыгадаю, мама,
Асеннім ранкам, любаю парой.



А. ЦВЯХ

## Я ХОЧУ

Среди друзей бываю
молчалив —
Жизнь городская вдруг
покажется постылой,
До боли в сердце я тогда хочу
Вновь побывать на Пуховщине
милой.
Попасть случайно в чащу
вековую,
На мох сырой ступить, робея,
Потрогать ель, от старости
седую,
И, гильзу старую найдя вдруг
у траншеи,
Не пнуть ее ногой, а положить
в карман,
И не сказать себе, что это —
окись меди,
А тихо прошептать:
«И здесь была война...»
И вспомнить тех, кто не
пришел к Победе...



## ЭЛЕГИЯ

Зачем все люди тянутся
к дождям?..
Ты в тихий лес войди порой
осенней,
Ты прикоснись к березовым
ветвям —
И лес с тобою станет
откровенней...
Ты слышишь?.. Это небо
шепчет нам,
Что в край наш осень
медленно вступает...
. . . . . . . . . . . . . . .
И все-таки никто из нас
не знает,
Зачем мы смутно тянемся
к дождям.

## Сустрэча з сонцам

**— Дзень добры, мама! Вось я зноў дома...**

**Якімі словамі можна выказаць любоў да роднай зямлі, да таго куточка, дзе ты нарадзіўся, вырас, адкуль пайшоў у жыццё. Ад успамінаў пра родны дом на сэрцы становіцца лёгка і цёпла. А колькі радасці бывае, калі зноў вяртаешся ў родныя мясціны. Ліпы, клёны, бярозкі... Усё гэта найпрыгажэйшым здаецца ў родным краі. І толькі цяпер стаў зразумелым сэнс гэтых сімвалічных слоў: «У зямлі нашы карэнні...».**

**Прыемна прачнуцца дома на досвітку і ўзысці на ўзгорак, адкуль відаць шырокая паласа перастаялай, пажоўклай ад частых дажджоў травы. Побач сінявокі Нёман задумліва коціць свае воды ўдалячынь. І можна толькі здагадвацца, як велічна і горда глядзяцца ў яго магутныя стогадовыя волаты-дубы, якія, здаецца, галінамі падпіраюць блакіт неба. У суровым маўчанні, выцягнуўшыся і пастрайнеўшы, стаяць ёлкі і сосны. Нешырокаю стужкаю з аднаго боку небасхілу цягнецца малочны, з сінявата адценнем туман, надаючы таямнічы і незвычайны выгляд дрэвам. З другога боку неба становіцца ўсё ружавейшым з кожнаю хвілінаю...**

**Вёска ўжо даўно прачнулася і жыве сваім будзённым жыццём. Усюды з комінаў уецца дым, чуваць рэдкае рыканне кароў, недзе зусім блізка залопаў крыламі, а затым звонка, на ўсё наваколле, закукарэкаў певень...**

**У гэты час праз густую ігліцу ёлак каля самага небасхілу прабіўся яркі, вясёлы прамень сонца. І адразу ўсё наваколле заіскрылася тысячамі сонечных зайчыкаў, усмешка зайграла на гладзі Нёмана. А само сонца, ласкавае і спакойнае, паволі выплывала з-за кашлатых ялін, азараючы ўсё навокал.**

**Дзіву даешся, як сосны ўвачавідкі дабрэюць. А ўсё ж такі сонцу цяжка прабіцца праз гэтую тоўшчу ігліц, і яго канцы заблыталіся, згубіліся недзе ў чашчобе, рассыпаючыся на мільёны іскраў. І здаюцца сосны казачнымі, ветлівымі, цёплымі. Сонца зрабіла іх такімі.**

**Здаецца, бачыш і адчуваеш, як раса з травы і ігліцы кропля за кропляй імкнецца ў вышыню і знікае ў небе. Гэта ўсё ад сонца. Яно п'е ваду — уздымае яе кроплямі-расінкамі, ператварае ў пару, воблакі, каб потым чыстым свежым дажджом яна пралілася на дрэвы, траву, на зямлю... Гэта яно, сонца, дорыць людзям радасць, падаўжае жыццё, яснай усмешкай адлюстроўваецца на тварах дзяцей. Як жа мы, людзі, павінны быць удзячны сонцу за цеплыню і ласку!**

**Сонца. Яно кліча нас наперад, азараючы шлях сваімі промнямі...**

**Л. АТРУШКЕВІЧ,**
**студэнтка І курса вячэрняга аддзялення журфака.**



Захапленне

Фотаэцюд В. Драчова.

СТУДЭНЦКАЯ РЭЦЭНЗІЯ

## УМОВЫ ШЧАСЦЯ

Уявім сабе, што шмат вякоў назад прызямліліся на нашай планеце прышэльцы з космасу. Яны параднілiся з зямлянамі і засталіся тут назаўсёды.

Прайшоў час. Людзі пачынаюць адчуваць у сваёй душы штосьці невыказна-шчымлівае. Іх раптам манзяць зоркі, цягне да іншых светаў, да невядомага жыцця. Яны чакаюць цуда...

Гэтая цудоўная выдумка— тэорыя героя п'есы «Фантазія Фарацьева» А. Сакаловай. Прэм'ера спектакля прайшла нядаўна на сцэне рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага. Аўтар у сваёй трагікамедыі зусім праўдзіва паказвае сучаснае жыццё з яго драматычнымі і камічнымі сітуацыямі. Глядач быццам прысутнічае на ўроку высакароднасці, дабраты, сумленнасці. І не можа застацца абыякавым да гэтай звычайнай гісторыі, да герояў.

Звычайная гісторыя...

Павел Фарацьеў (А. Ткачонак), трыццаці пяці гадоў, па прафесіі зубны ўрач, закахаўся ў маладую жанчыну Аляксандру (Л. Былінская), з якой пазнаёміўся ў доме свайго таварыша Бетхудава. Закахаўся неяк нечакана для сябе. Спачатку ён заўважыў у яе вачах пакуты, потым незразумелае і цудоўнае пачуццё. І вось прызнанне ў каханні. Павел просіць Аляксандру стаць яго жонкай. Неахвотна жанчына згаджаецца, таму што даўно, хоць і без узаемнасці, любіць Бетхудава. Маці (А. Шах-Парон) і сястрычка Люба (А. Пасцярэвіч) задаволены жаніхом і рады, што, нарэшце, іх Саша стане спакойнай і шчаслівай.

Развязка спектакля нечаканая. Каханая Фарацьева ўходзіць да Бетхудава. Не можа Аляксандра з удзячнасці да Фарацьева здрадзіць свайму каханню, такому вялікаму і самаадданаму.

Вось і ўсё.

Міжволі ўзнікае пытанне: што ж імкнуўся аўтар сказаць, паказаць сваёй звычайнай гісторыяй? Не ўсе шчаслівыя ў каханні? Так. Але няхай людзі разумеюць адзін аднаго, вераць у высакароднасць, дабрату. Тады яны будуць вышэй свайго гора.

Відавочна, А. Сакалова хацела выразіць у тэорыі наіўнага дзівака Фарацьева аб касмічных прышэльцах думку, што душа чалавечая не можа жыць без высокага, без цудоўнага, без паэтычнага. Гэтую ідэю данеслі да гледачоў артысты— і перш за ўсё маладыя выканаўцы. Роля Фарацьева, на мой погляд, вельмі ўдалася А. Ткачонку. Ён ужыўся ў аблічча свайго добрага фантазёра і паказаў яго на сцэне так, як сам разумеў і лічыў патрэбным. Е. Пасцярэвіч, якая іграла Любу, сэрцам сваім знайшла рысы непасрэднай, эмацыянальнай Любы.

Ветэраны тэатра А. Абуховіч, Л. Былінская, А. Шах-Парон прафесіянальна выканалі свае ролі, яшчэ раз пацвердзілі сваё майстэрства.

Такім чынам, трагікамедыя «Фантазія Фарацьева» пачала сваё жыццё. Хвалюючая сучасная п'еса дазволіць гледачу ацаніць мастацкія магчымасці новага драматурга і ўменне акцёраў стварыць тыповыя вобразы.

**В. ЕРМАКОЎ,**
**студэнт журфака.**

**Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.**

НАШ АДРАС **220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.**

АТ 03008 **Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.** Заказ № 13.